# «Пяром душа вадзіла...»

**Сустрэча пад такою назваю з паэтам, сябрам Гродзенскага абласнога аддзялення Саюза пісьменнікаў Беларусі Мікалаем Іваноўскім адбылася ў філіяле «Стралецкая сельская бібліятэка» ДУК «Мастоўская раённая бібліятэка».**


*Слова трымае Мікалай Іваноўскі.*

У імпрэзе ўзялі ўдзел прадстаўнікі аматарскага аб'яднання для пажылых людзей «Сустрэчы» і актыўныя чытачы кніжніцы.

Бібліятэкар Ніна Марчык распавяла пра знакамітых асоб Мастоўшчыны. Потым Мікалай Іваноўскі пазнаёміў прысутных са сваёй творчасцю, якая звязана з мастоўскай зямлёю, прачытаў вершы аб родным краі, вёсцы Пачуйкі Ваўкавыскага раёна, дзе нарадзіўся і жыве цяпер.

У выкананні госця прагучалі вершы, прысвечаныя 75-годдзю Вялікай Перамогі. Шмат паэтычных радкоў Мікалай Іваноўскі прысвяціў маці, родным і блізкім. Ёсць у яго і гумарыстычныя творы.

Бібліятэка атрымала ў падарунак кнігу «Кроплі расы» з аўтографам творцы.

Імпрэза ладзілася ў межах раённай бібліятэчнай праграмы «Узрост жыццю не перашкода» (2019—2020 гг.).

**Вольга КОРШУН,**
**фота аўтара**

ЛіМ № 32 (5088) 28 жніўня 2020 г.